# СУБ’ЕКТНА-АСОБАСНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ У КАНТЭКСЦЕ ГЛАБАЛЬНАЙ СУТНАСЦІ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

*А.У. Кузьменка*
*(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, Мазыр)*

Працэсы глабалізацыі запатрабаваны сёння на многіх узроўнях грамадскай свядомасці і дзейнасці. У сферы адукацыі і, больш таго, педагагічнай, яны маюць асаблівае значэнне. Сучаснае разуменне кампетэнтнасці педагога неабходна будаваць зыходзячы з асэнсавання глыбокіх сутнасных асноў яго прафесійнай падрыхтоўкі, глабальнага зместу яго дзейнасці, а таксама ролі яго асобаснага патэнцыялу ў сучасных сацыякультурных працэсах. Педагагічная адукацыя не можа мець у якасці сваёй выключнай мэты толькі падрыхтоўку да прафесійнага тэхналагічнага выканання спецыяльных дзеянняў. Яна павінна разглядацца ў глыбокім кантэксце развіцця асобы, фарміравання адзінай прафесійна-асобаснай сістэмы будучага педагога, якая стварае аснову цэласнага разумення чалавекам самога сябе і вызначае здольнасць працаваць з мэтамі і ва ўмовах развіцця іншай асобы. Фарміраванне такога вопыту патрабуе ўзмацнення суб’ектна-асобаснага пачатку ў адукацыйным працэсе.

Суб’ектна-асобасная сутнасць узаемадзеяння, на наш погляд, шмат у чым адлюстроўвае мэты і змест глабалізацыі педагагічнай адукацыі, а ўзровень сфарміраванасці дадзенай кампетэнтнасці ў будучых педагогаў будзе сведчыць аб выніковасці гэтых працэсаў.

У разуменні глабальнай сутнасці адукацыі мы прасочваем дзве адносна самастойныя часткі. З аднаго боку, гаворка ідзе аб глабалізацыі як узмацненні сацыякультурнага зместу і значэння адукацыі, з другога боку, як аб неабходнасці авалодання яе глыбокімі філасофска-светапогляднымі сэнсамі.

Сацыяльнасць прафесійна-педагагічнай кампетэнтнасці відавочная. Яна вынікае з сацыяльнай абумоўленасці мэт педагагічнай дзейнасці, характару педагагічнага ўзаемадзеяння, сутнасці самой асобы. Сучасныя даследчыкі кампетэнтнаснага падыходу, вызначаючы сэнс кампетэнтнасці, падпарадкоўваюць яе неабходнасці і важнасці дасягнення новай якасці грамадскіх адносін, стварэнню новых сэнсаў дзейнасці. І менавіта суб’ектна-асобасныя адносіны, з’яўляючыся ўключанымі ў структуру асобы, надаюць асаблівы характар і змест сацыяльнаму ўзаемадзеянню,

МГПУ им. И.П. Шамякина

спрыяюць творчай рэалізацыі асобы і выводзяць яе дзейнасць на ўзровень культуратворчых працэсаў.

Глабальныя кампетэнцыі, пазначаныя на міжнародным узроўні як пажаданы вынік адукацыі ў XXI стагоддзі (навучыцца жыць разам, навучыцца набываць веды, навучыцца працаваць, навучыцца жыць), у дачыненні да галіны педагагічнай адукацыі і педагагічнай дзейнасці маюць двайное праламленне і ўласна педагагічны сэнс. У змест педагагічнай кампетэнтнасці, акрамя адзначаных вышэй, глабальных кампетэнцый у сілу мэт і зместу педагагічнай дзейнасці ўваходзяць і наступныя: навучыць жыць разам, навучыць набываць веды, навучыць працаваць, навучыць жыць. Характарыстыкамі сістэмаўтваральнага элемента і ўмовы развіцця глабальных педагагічных кампетэнцый, якія праяўляюцца ў сістэме «навучыцца... – навучыць...», на наш погляд, і валодаюць суб’ектна-асобасныя адносіны, што рэалізуюцца на прафесійным узроўні ў адукацыйным асяроддзі ВНУ і школы.

Глабальны ўзровень зместу педагагічнай адукацыі заключае неабходнасць асэнсавання і разумення сутнасці самой катэгорыі суб'ектнасці.

Паводле В.А. Пятроўскага, суб’ектнасць ёсць уласцівасць самадэтэрмінацыі чалавечага быцця ў свеце. Суб'ектнасць азначае дзейнасны,аднаўленчы і пераўтваральны пачатак у чалавеку. Гэта паняцце супярэчлівае па сваёй сутнасці, і, такім чынам, асэнсаванне чалавекам сваёй суб'ектнасці, набыццё яе з'яўляецца крыніцай і рухаючай сілай асобаснага развіцця. У суб’ектнасці прадстаўлены адначасова характарыстыкі сацыяльнай неабходнасці, адказнасці асобы за змест сваёй дзейнасці і нарматыўнасць адносін, а таксама аўтаномнасці, незалежнасці, «самазаконнасці асобаснага быцця» і адказнасці, перш за ўсё , перад самім сабой. «Узыходжанне ад неабходнасці да свабоды» ёсць, хутчэй за ўсё, тая логіка, у якой і ажыццяўляюцца працэсы самаразвіцця асобы і культуратворчыя асновы яе жыццядзейнасці. Гэтыя глыбінныя сэнсы ў высокай ступені з’яўляюцца актуальнымі ў выпадку педагагічнай дзейнасці і педагагічнага адукацыі [1].

Фарміраванне суб’ектнасці асобы заключае неабходнасць авалодання ёю адпаведнымі ўстаноўкамі. Прыярытэтнай у адносінах да традыцыйнай устаноўкі на «ацэнку іншага вопыту» з’яўляецца ўстаноўка на самапазнанне і самаарганізацыю, накіраванасць да сабе, да свайго духоўнага вопыту, пошук і зацвярджэнне культуры ў сабе праз гарманізацыю адносін да навакольнага свету. Авалоданне будучым педагогам такой логікай асэнсавання і пабудовы ўласных адносін да сябе і «іншага значнага» забяспечвае фарміраванне прафесійна-педагагічных адносін крыху іншага зместу і парадку, спрые ўзвядзенню іх на ўзровень

МГПУ им. И.П.Шамякина

чалавекатворчых працэсаў. Асобаснае засваенне і прыняцце такіх сэнсаў і вопыту магчыма на аснове сур'ёзнай метадалагічнай і культуралагічнай падрыхтоўкі будучага настаўніка, патрабуе стварэння адпаведнай адукацыйнай прасторы, адкрытага дыялогавага асяроддзя, якое ствараецца, паводле выразу А.Б. Арлова, на аснове гуманістычнай цэнтрацыі як цэнтрацыі чалавечай сутнасці, уласцівай уласнаму «Я» і іншым людзям.

Разуменне суб'ектнасці, эфектыўнае яе фарміраванне ў будучых педагогаў магчыма і павінна ажыццяўляцца на аснове філасофска-светапогляднага асэнсавання фундаментальных прынцыпаў, якія выступаюць у якасці каштоўнасцей, што дазваляюць глыбока абгрунтавана мадэляваць адукацыйны працэс, яго формы, змест. Такімі прынцыпамі на агульнафіласофскім узроўні пазначаны: прынцып адкрытасці, які разумеецца як незавершанасць у прасторы і бясконцасць у часе, што дазваляе на педагагічным узроўні разумець сутнасць дзіцяці, разумець і прымаць яго індывідуальнасць і самакаштоўнасць, індывідуальны шлях яго развіцця; прынцып унікальнасці як непаўторнасць з'яў, а значыць, іх супярэчлівасць і непрадказальнасць, асэнсаванне якога дазваляе разумець асновы педагагічнага ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва, вырашэння супярэчлівасцей; прынцып надмернасці як магчымасць знаходжання стваральнай энергіі, які абгрунтоўвае магчымасць творчага пошуку, супрацоўніцтва, вырашэння складаных праблем, неабходнасць аптымістычнага стаўлення да дзіцяці, магчымасцяў яго развіцця [2].

Глабальны ўзровень педагагічнай адукацыі і разумення педагагічнай кампетэнтнасці ніяк не адмаўляе неабходнасць іх дэталізацыі, распрацоўкі тэхналагічных падыходаў і адпаведных педагагічных метадаў. Гаворка ідзе пра трансфармацыю глыбокіх метадалагічных падстаў педагагічнай адукацыі ў працэсы рэальнай педагагічнай дзейнасці і адносін, аб канкрэтызацыі глабальных каштоўнасцей і сэнсаў у яе змест. І менавіта суб'ектна-асобасны ўзровень педагагічнага ўзаемадзеяння можа садзейнічаць гэтаму працэсу.

Літаратура

1. Вишневский, М.И. Философский синтез как мировоззренческая основа образования: монография / М.И. Вишневский. – Могилев: Изд-во Могилев. гос. ун-та им. А.А. Кулешова, 1999. – 252с.

2. Культуросообразная школа: науч.-метод. сб. (Новые ценности образования: вып. 11). – М., 2002. – 192 с. –

МГПУ им. И.П.Шамякина